

## Міхаіл Аляксеевіч
# Б і л і м а ў

*"Памочнік сакратара паклікаў Білімава з прыёмнай, дзе ён, аказваецца, ужо чакаў, і паказаў рукою на крэсла ў канцы даўжэзнага паліраванага стала... Білімаў павітаўся, але на крэсла не сеў - аберуч прыўзняў крэсла за спінку, бліжэй падсунуўся да стала. Мы даўнавата не страчаліся, і, пэўна, таму адразу кінулася ў вочы, што старшыня прыкметна "здаў": твар пашарэў, асунуўся, на скронях выступіла сівізна, пад левым вокам раз - пораз варушыцца непаслухмяны нервовы цік.*

*А некалі, роўна трынаццаць гадоў таму назад, гэта быў дзябёлы, ружавашчокі мужчына – "у самым саку", гаварылі пра яго. Па-сялянску моцна скроены, ён вылучаўся і зграбнасцю паходкі, і нязменным прыўзнятым настроем, і адметнай цеплынёй сінявокага позірку, і – галоўнае – глыбокім веданнем жыцця сучаснай вёскі. Сем гадоў запар мы побач садзіліся за гэты самы стол, амаль штодня калясілі па раёне, дапамагалі адзін аднаму ў рабоце – словам, жылі якраз так, як і павінны жыць рэдактар раённай газеты і начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкома. "Нармальна жылі", - сказаў бы на гэта Білімаў."*

В.Праскураў
"Наўсцяж вясковай вуліцы".

*Першае маё знаемства з Васілём Праскуравым адбылося на адным з паседжанняў бюро райкома. Мне, маладому старшыні калгаса, прыйшлося выступаць на чарговым паседжанні з прапановай аб спецыялізацыі гародніны ў калгасе. Пасля выступлення слова ўзяў Васілій Фёдаравіч, рэдактар раённай газеты, член бюро, чалавек які добра ведаў жыццё раёна, лічыўся чалавекам граматным і, безумоўна, аўтарытэтным. Ён падтрымаў маё меркаванне, падкрэсліўшы, што ўкараніўшы дадзеную прапанову можна атрымаць добры вынік. Затым з Васілём Фёдаравічам мне часта прыходзілася сустракацца. Ён прыязжаў у калгас у якасці карэспандэнта, адной кампаніяй хадзілі на паляванне, проста любілі пагаварыць аб справах вясковых, аб жыцці, якое так любіў, і любоў да якога пранёс да апошніх гадоў жыцця.*

*Помніцца, што заўсёды ў руках Васіля Фёдаравіча была запісная кніжка. Людзі іх праца, прыгажосць нашых мясцін - усё для Васіля Фёдаравіча было блізкім і цікавым. Прыязжаючы ў калгас ён не шукаў кіраўніцтва. Вёў размову з простымі людзьмі, умеў і любіў пажартаваць.*

*Аб тым, што Праскураў піша нарысы аб земляках мне было добра вядома, а вось аб тым, што я з'яўляюся герам яго нарысаў не ведаў да апошняга.Толькі калі кніга ўбачыла свет Васілій Фёдаравіч падарыў мне яе са сваім аўтографам і па сённяшні дзень я яе захоўваю ў асабістай бібліятэцы.*

*Добры быў гэта чалавек. У ім спалучаліся чуласць, душэўнасць, чалавечнасць і прынцыповасць. Ён імкнуўся зрабіць усё дзеля таго, каб дапамагчы чалавеку, вырашыць яго праблему. Гэта быў чалавек, які меў адкрытае сэрца, добрыя думкі, чулую душу, высакародныя ўчынкі. Такім ён і застаўся ў памяці тых, хто яго любіў і паважаў.*